Як паведаміў БелаПАН кіраўнік прэс-службы абласнога ўпраўлення Міністэрства па надзвычайных сітуацыях Сяргей Машноў, інфармацыя аб тым, што жыхарка вёскі Быцень убачыла ў адным з калодзежаў жанчыну, паступіла ў цэнтр аператыўнага кіраўніцтва раённага аддзела па надзвычайных сітуацыях у 8.46 раніцы. Адразу ж на месца здарэння выехала група ратавальнікаў, якія з дапамогай лесвіцы і вяроўкі выцягнулі пацярпелую. З дыягназам пераахаладжэнне яна была дастаўлена ў цэнтральную раённую бальніцу. Зараз яе жыццю нічога не пагражае.

Прычыну, па якой 52-гадовая жыхарка горада Івацэвічы апынулася ў калодзежы, зараз высвятляюць супрацоўнікі мясцовага РАУС. Вядома, што яна прыехала ў вёску ў госці да сваёй маці.

Ларыса ШЫГАНАВА.

Народная Воля http://www.nv-online.info
2 ЛЮТАГА 2007 г.

АБИТУРИЕНТ-2007

Александр ЖУК,
первый заместитель министра образования:

«Вступительные тесты никто отменять не собирается»

Ожидаются ли в стране очередные новации в проведении вступительных экзаменов? После выволочки, которую устроил Александр Лукашенко министру образования Александру Радькову 19 декабря 2006 года, этот вопрос снова стал беспокоить и выпускников, и родителей, и учителей. На том заседании Лукашенко "инкриминировал" министру Радькову все новшества в системе образования, но особо досталось тестированию. "С помощью тестов определяя будущих студентов, — как школьника, отчитывал Радькова Лукашенко, — мы абсолютно не учитываем все качества абитуриентов. Преподаватели говорят: сидит перед тобой абитуриент, и вы чувствуете логику его рассуждений. Через тесты это сделать невозможно".

До вступительной кампании 2007 года осталось менее полугода. И вполне объяснимо волнение будущих абитуриентов. Кто-кто, а они уж точно помнят о прошлогодних сюрпризах Министерства образования, когда за полгода до вступительной кампании вдруг выяснилось, что при поступлении в вузы будет учитываться средний балл аттестата. Вряд ли кто-либо удивится, если и сейчас, после совещания у Лукашенко, Минобразования придумает новую форму сдачи вступительных экзаменов. Правда, первый заместитель министра образования Александр Жук говорит, что повода для беспокойства нет. Нынешняя вступительная кампания пройдет по тем же правилам, что и прошлогодняя.

— На совещании у президента речь шла не о том, что надо отменять тесты, — говорит Александр Иванович. — А о том, что не надо каждый год менять правила приема в вузы. Поэтому мы и планируем как минимум ближайшие года дважды ничего не менять, система должна устояться. Тем более что и критической ситуации нет. Результаты тестирования показывают, что выдержаны самые главные принципы поступления в вузы — справедливость, прозрачность и равные условия для всех поступающих. Кроме того, опыт последних лет показывает, что сильным учащимся, выпускникам лицеев, гимназий, спецклассов все равно, в какой форме сдавать экзамен — устно, письменно или писать тесты. Эти учащиеся, как правило, подтверждают свои знания. Так что в этом году вступительные тесты никто отменять не будет. Единственное, что третий экзамен мы снова отдадим на откуп вузам. Каждый вуз сам будет определять форму сдачи этого экзамена — провести его в форме тестирования, либо устно, либо письменно.

— Будет ли в этом году при поступлении учитываться средний балл аттестата?

— Да, и я считаю, что это очень важно. Прежде, чем вернуть в прошлогоднюю вступительную кампанию это положение, специалисты системы образования много думали, анализировали. Мы заметили, что в последние годы, когда началось активное внедрение тестирования, старшеклассники выбирали только три-четыре предмета и углубленно изучали их, забывая о других дисциплинах. Случалось даже такое, когда ученики игнорировали некоторые предметы и не ходили на занятия. А задача школы — это не только подготовка учащихся для поступления в вузы. Задача школы — воспитание гармонично развитой личности.

— Александр Иванович, на упомянутом совещании из уст Александра Лукашенко прозвучало еще одно очень любопытное замечание. "Мы слишком шикарно живем, не имея практически в стране ни нефти, ни газа, — заявил он. — Лишние структурные звенья в бюджетных организациях в ближайшее время должны быть ликвидированы. В системе образования, а может, и здравоохранения, мы живем не по средствам". Не ожидаются ли в вашем ведомстве штатные сокращения?

— По-моему, так вопрос не ставился. Министерство образования Беларуси — очень оптимизированное ведомство. В советские времена было три отдельных министерства — высшего и среднего специального образования, Министерство науки и просвещения, а также Госкомитет профессионального образования, в которых работало свыше 360 работников. Сегодня эти ведомства заменило Министерство образования, в котором трудится в два раза меньше сотрудников — 180 человек. Причем специалисты ведомства разрабатывают учебные планы, законы делают ту работу, которая раньше выполнялась в Москве...

Ольга ГРИНЕВИЦКАЯ.

АСОБА

Ці дапаможа нам Усход?

Рыгор Барадулін зноў прадстаўлены на намінацыю ў Нобелеўскі камітэт

Здаецца неверагодным, але ў Рыгора Барадуліна, якому за 70 гадоў, быццам адкрылася другое дыханне: апошнім часам у Беларусі і па-за яе межамі выходзяць адна за адной ягоныя кнігі. Так, 2007 год толькі пачаўся, а ўжо выйшла новая кніга народнага паэта "Гуканне паэзіі Усходу". Выдадзеная, як і "Ксты", Рымска-каталіцкай парафіяй Святога Сымона і Святой Алены, яна ўключае пераклады (ці, як пазначыў сам Барадулін, "пазыкі") класічнай паэзіі Кітая, Японіі, Карэі і В'етнама. Дарэчы казаць, гэтая кніга ўключана ў пакет матэрыялаў, якія на мінулым тыдні былі перададзены ў Шведскі нобелеўскі камітэт для паўторнага вылучэння Рыгора Барадуліна на Нобелеўскую прэмію.

У анатацыі да кнігі напісана: "Радзіма сонца — Усход. Радзіма першапаэзіі — Усход. Радзіма Вечнае Кнігі — Усход. Пагукаць паэзію Усходу па-беларуску паспрабаваў Рыгор Барадулін..." У гэтым паэтычным зборніку чытач знойдзе такія сусветна вядомыя імёны, як Ван Вэй, Лі Бо, Ду Му, Су Дун-По (Кітай), Сайгё, Басё, Бусон, Іса (Японія), Чхве Чхівон, Чон Чхоль, Сін Хым (Карэя), Ман Зіяк, Чан Нян Тонг (В'етнам) і імёны дзесяткаў іншых вядомых паэтаў гэтых краін. "Па часе гэта вершы, пачынаючы з VIII стагоддзя, —- гаворыць Ала Сакалоўская, рэдактар і разам з пробашчам Уладзіславам Завальнюком складальнік гэтай кнігі. — Здавалася б, такі далёкі час, такія далёкія краіны, а чытаеш гэтую кнігу — і знікае адчуванне прасторы і часу, бо гэта сапраўдная паэзія. Яна — агульначалавечая, для яе няма прасторы і часу. І дзякуючы вялікаму і непаўторнаму таленту Рыгора Барадуліна, вішня, якая цвіце на Усходзе, успрымаецца як тая, што цвіце каля тваёй хаты. Ты чуеш, як "плачуць без просыху пад вясновым дажджом салаўі", "травеньскіх ліўняў гнеў", як "на аблачынцы, адпачываючы, пяюць жаўрукі", бачыш, як пасля дажджу "жабка заплыла ў дом цераз парог"... Усе гэтыя пачуцці і думкі — вечныя. Кожны, хто прачытае гэтую кнігу, зразумее, якая вялікая і адначасова малая наша планета. Зразумее, што час, прастора не мяняюць чалавека, яго сутнасць. Мяняюцца толькі краявіды, мовы, адзенне. А чалавек нашага часу думае, разважае, радуецца, пакутуе, плача і смяецца, як і чалавек далёкіх вякоў. Усё гэта адчуць і ўбачыць можна праз сапраўды беларускія пераклады-пазыкі Рыгора Барадуліна. Гэта вялікае шчасце Беларусі, што Усявышні даў нам чаканага паэта — Рыгора Барадуліна, які не толькі піша непаўторныя арыгінальныя вершы, але і з высокім майстэрствам набліжае да нас паэзію іншых народаў і часоў".

Між іншым, гэтае выданне аказалася своечасовым яшчэ і таму, што на мінулым тыдні Саюз беларускіх пісьменнікаў у другі раз прадставіў Рыгора Барадуліна на намінацыю ў Нобелеўскі камітэт (адзначым, што вылучылі паэта на прэмію прафесар, загадчык кафедры замежнай літаратуры Мінскага дзяржаўнага лінгвістычнага універсітэта Юрый Стулаў і пробашч Чырвонага касцёла Уладзіслаў Завальнюк). У пакет жа матэрыялаў, акрамя "Гукання паэзіі Усходу", у першую чаргу ўваходзіць кніга "Ксты", а таксама яе значна дапоўненае перавыданне, якое было надрукавана напрыканцы 2006 года, беларуска-англійскі паэтычны зборнік "Быць!", чэшская і польская кнігі Р.Барадуліна мінулага года. Але як паставяцца ў Нобелеўскім камітэце да лепшага беларускага паэта мяжы двух тысячагоддзяў (а па вялікім рахунку — да Беларусі і беларусаў), можна будзе дазнацца толькі ў гэтую восень.

Сяргей ШАПРАН.

ЧУЛІ?

«Прыорбанк» спыніў выдачу крэдытаў у беларускіх рублях

Калі глядзець беларускае тэлебачанне і слухаць афіцыйных асоб, то ў краіне ўсё вельмі добра і ніякіх падстаў хвалявацца няма. Тым часам адзін з найбуйнейшых банкаў краіны — "Прыорбанк" — праз агенцтва "Інтэрфакс" распаўсюдзіў інфармацыю аб спыненні выдачы насельніцтву крэдытаў у беларускіх рублях. Прычына гэтага, па версіі прадстаўнікоў банка, — вузкасць і даражыня грашовага рынку.

Па чутках, пазыку ў нацыянальнай валюце не даюць і іншыя банкі.

Ул.інф.

АЗБУКА ПОЛИТОЛОГИИ

Баллада о рейтинге

Популярность политика измеряется его рейтингом — это азбука. В странах с авторитарными политическими режимами нет политики в западном смысле, а значит, нет и рейтингов. Его нет ни у официальных глав государств, ни тем более у представителей оппозиции. Отсюда вытекает неожиданный вывод. Ответа на вопрос "Если не он, то кто же?" до поры до времени в Беларуси просто не может существовать.

«Не было этого!»

Позвольте, а как же Лукашенко? Уж он-то отсутствием популярности не страдает. Для понимания феномена белорусского "батьки" продолжим урок российского социолога Юрия Левады, начатый в "Народной воле" №№196—197 от 8 декабря: *"Существуют серьезные различия между социальными значениями рейтингов общественного мнения в плюралистических, конкурентных обществах и в нашей современной ситуации"*. В чем эти различия? На Западе рейтинг — показатель конкурентоспособности. У нас же *"рейтинг лидера исполняет совершенно иную функцию — поддержание его имиджа в собственных и "массовых" представлениях"*.

На Западе у любого политика, даже самого популярного, рейтинг "плавающий". Он — продукт общественного мнения, которое через СМИ отслеживает каждый шаг представителей политической элиты, оперативно реагируя на их малейшее телодвижение. У нас же рейтинги выражают не оценки действий данного лидера, а массовые ожидания, надежды и иллюзии, связанные с ним.

Но с однажды сформировавшимися надеждами люди так просто не расстаются. Поясню на конкретном примере. В 1995 году, на следующий день после знаменитого интервью Лукашенко немецкой газете "Хандельсблат", я общался с работниками государственной типографии "Чырвоная зорка". Они были стойкими "лукашистами", и на этой почве у нас часто разгорались эмоциональные споры.

Интервью предоставило мне "убойный" аргумент, и я наивно полагал, что с его помощью сумею переубедить своих оппонентов. Но не тут-то было. Мое цитирование первоисточника было решительно отвергнуто: "Не было этого". Факт передачи интервью по радио и то, что я слышал его собственными ушами, не произвел никакого впечатления. Меня не обвинили во лжи, и тем не менее — не было этого.

Для объяснения случившегося необходимо понять скрытый подтекст спора. Мои оппоненты защищали не лично Лукашенко. Они защищали свою надежду, я же попытался их этой надежды лишить. Если бы против моих доводов они могли выдвинуть свои, они бы их выдвинули. Но в данном случае таковых не оказалось, поэтому и родилась столь универсальная формула: "Не было этого".

Природа безальтернативности

Лукашенко — харизматик. По крайней мере, существует такое расхожее мнение. А вот среди оппозиционеров соизмеримой личности нет. В этом, по мнению многих, и заключается главная проблема белорусской демократии. Отсюда бесконечные предложения по ее поиску, созданию, назначению, выбору и т.п. Словом, есть, где развернуться интеллекту...

В Беларуси политика заменена административным управлением, осуществляемым через "вертикаль". Не удивительно, что ключевыми фигурами у нас являются не политики, а чиновники. Последние уже в силу своей природы не способны заниматься согласованием интересов. Они лишь исполняют поручения. По мнению Левады, *"в такой структуре для политических и персональных альтернатив просто нет места. Исключительное положение "первого лица" определяется не его собственными талантами или достижениями — реальными или приписываемыми, а прежде всего его статусом в системе власти. Технология властвования тоже как бы деполитизируется, превращается в оперативную манипуляцию людьми или должностями и полномочиями"*.

У оппозиционных политиков нет рейтингов. А у неоппозиционных? Какой рейтинг у премьера, у председателей палат Национального собрания? И вообще, как их хотя бы зовут? Имя премьера я запомнил. Он мой тезка. С законодателями задачка посложнее. По крайней мере, лично для меня практически неразрешимая.

От любви до ненависти

Насколько описанная картина безальтернативности стабильна? Когда и в силу каких причин в обществе появится спрос на нового лидера? В сжатом виде ответ прост — не раньше, чем в головах большинства освободится для него место. Но подобная простота порождает лишь очередную цепочку вопросов, ничего конкретно не поясняя.

Символом каких надежд является сегодня Лукашенко? В первую очередь — стабильности. Откройте литовский бюллетень "Инфофокус", в котором печатаются результаты исследований независимых социологов. Интересная получается картина. Белорусы в курсе предстоящего повышения цен на газ. Они проинформированы. И тем не менее 61,6% считают, что положение в стране развивается в правильном направлении, а только 24,0% — что в неправильном. Дальше — больше: 42,5% против 10,7% надеются на улучшение социально-экономической ситуации в Беларуси в ближайшие годы, а 37,7% рассчитывают на ее неизменность. Ну кто скажет, что в Беларуси отсутствует стабильность!

У стабильности есть персональное имя. Мы все его знаем. В этом сила и слабость белорусской стабильности. Когда судьба 10 миллионов человек зависит от веры в одного, то вероятность неожиданных перемен становится реальной. Всякое может случиться. В конце-то концов, человек может наступить на арбузную корку или, что вероятнее, промахнуться подобно Акеле. Какой же он после этого лидер?

Напомню историю из Евангелия. Христос въезжает в Иерусалим, и восторженные поклонники встречают его как Бога. Но что происходит через две недели? Те же люди кричат: "Распни его!" Почему за столь короткий временной промежуток они прошли свой путь от любви до ненависти? Ответ прост: религиозные фанатики встречали Бога, а на суде увидели простого смертного, не способного защитить самого себя. Причину подобного разочарования одним из первых в XIX веке понял французский мыслитель А.де Токвиль: *"Возмущаются прежде всего те, кто обманут в своих надеждах"*.

Ловушка простых решений

Вероятность перемен в общественном настроении в Беларуси достаточно велика. В недавней истории тому несложно отыскать соответствующий пример. После президентских выборов 2001 года рейтинг Лукашенко покатился вниз. Объяснение лежит на поверхности: в апреле 2002 г. 55% белорусов отмечали ухудшение своего материального положения (сегодня таких 12%). Все это так, но к каким политическим последствиям подобный рост числа недовольных привел?

От недовольства до осознанных совместных действий — дистанция огромного размера. Кроме того, власть опирается в первую очередь не на рейтинги, а на бюрократию и силовые структуры, а таковых в Беларуси пруд пруди.

Левада выделял *"два крайних варианта "качества" общественного доверия в отношении политического лидера: доверие как лояльность (к существующему порядку) и доверие как надежда на изменение"*. В Беларуси появился третий вариант: доверие как удовлетворенность от достигнутого результата. Не случайно в ответах на вопрос "Почему Вы доверяете президенту?" на первом месте уверенно лидирует ответ: "Потому, что он успешно справляется с проблемами, стоящими перед страной" (31,6%). Что касается доверия как надежды ("Потому, что надеюсь, что он в дальнейшем сможет справиться с проблемами страны"), то здесь частота ответов на порядок ниже (3,2%).

Самое опасное, что может сегодня произойти в оппозиционной части белорусского общества, — это формирование надежды на простые решения. Появились даже рассуждения о том, что делать оппозиции после того, как власть сама упадет им в руки. Сами же, как известно, только кошки родятся, но и эта житейская аксиома в последнее время все чаще подвергается сомнению. Даже у кошек далеко не все так просто...

Сергей НИКОЛЮК.

ІНІЦЫЯТЫВА

Кодэкс адукацыі

Разумныя людзі кажуць: век жыві — век вучыся. Сістэму беларускай адукацыі чакаюць істотныя змены: Палата прадстаўнікоў рыхтуе дакумент з інтрыгуючай назвай "Кодэкс аб адукацыі". У талмудзе не на адну сотню старонак плануецца звесці ў адзінае цэлае ўсе заканадаўчыя акты, якія рэгулююць беларускую сістэму адукацыі.

"Аналага Кодэксу аб адукацыі няма ні ў адной краіне свету, за выключэннем Францыі, — кажа старшыня камісіі па адукацыі, культуры, навуцы і навукова-тэхнічным прагрэсе Уладзімір Здановіч. — Суседка Расія спрабавала падрыхтаваць падобны закон, але высілкі аказаліся марнымі. Палата прадстаўнікоў плануе ўвесну накіраваць Кодэкс аб адукацыі ў Савет міністраў, і, калі ўрадавы праект "канцэптуальна задаволіць" дэпутатаў, тады ўжо ўвосень варта чакаць прыняцця дакумента ў першым чытанні..."

Беларуская сістэма адукацыі ахоплівае ўсе пласты працэсу адукацыі: дашкольную адукацыю, адукацыю дзяцей з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця, агульную сярэднюю школу, прафесіянальна-тэхнічную, сярэднюю спецыяльную адукацыю, вышэйшую адукацыю.

Праект Кодэкса ўстанаўлівае, што працэс адукацыі чалавека пачынаецца... з двух месяцаў ад роду. Вучоба пачынаецца з пялёнак і ў прамым сэнсе. У Беларусі дасюль няма асобнага закона, дый не было, які рэгулюе сферу дашкольнай адукацыі — Кодэкс аб адукацыі мае запоўніць гэты прабел. Спецыялісты апасаюцца, як бы не адбылося змяшэнне вучобы ў дзяцінства.

"Мы яшчэ не ведаем, якое здароўе будзе ў выпускнікоў, якія пачалі вучобу з шасці гадоў і атрымліваюць 12-гадовую адукацыю", — кажа У.Здановіч.

Што да вышэйшай адукацыі, то закон, які рэгламентуе гэтую сферу жыцця, блукае па калідорах улады ўжо чатыры гады...

Георгій ГЛЕБУСЬ.

ТРАГЕДЫЯ

Смерць дайвера

У кар'еры недалёка ад горада Беразіно загінуў адзін з самых вопытных беларускіх дайвераў
Дзмітрый Кавальчук

Трагедыя адбылася вечарам 23 студзеня. Палюючы ў кар'еры з ліхтаром, Дзмітрый не ўсплыў на паверхню. На пошукі дайвера былі сцягнуты ўсе "падводныя" сілы Беларусі: прымалі ўдзел супрацоўнікі спецыяльнага атрада Міністэрства па надзвычайных сітуацыях, Таварыства ратавання на водах, прадстаўнікі падводных клубаў краіны, а таксама сябры Дзмітрыя Кавальчука. Пошукі ўскладняліся дрэннай бачнасцю на глыбіні (глыбіня нешчаслівага кар'ера 14—18 метраў), а таксама мутнасцю вады. Бачнасць у вадаёме, як паведамілі нам удзельнікі пошукаў, не перавышае аднаго метра. З мінулай пятніцы асноўныя пошукавыя працы былі спынены, паколькі на вадаёме стаў лёд, які не дазваляе нырацьі не дазваляе працаваць на вертыкальных спусках.

Планавалася, што калі таўшчыня лёду дазволіць, то праца па пошуку Дзмітрыя Кавальчука будзе працягнута ў другой палове гэтага тыдня.

34-гадовы Дзмітрый Кавальчук захапіўся падводным паляваннем сем гадоў таму. У прафесійны дайверскі клуб ён прыйшоў як рыбалоў-аматар, а, спусціўшыся некалькі разоў на глыбіню, захапіўся падводным паляваннем. Некалькі гадоў таму Кавальчук стаў дырэктарам аднаго з самых моцных падводных клубаў Беларусі "Паралельны свет". У самім клубе, які ўзначальваў Кавальчук, ад каментарыяў пакуль адмаўляюцца. Карэспандэнту "Народнай волі" там адказалі: "Пакуль рана што-небудзь каменціраваць. Ніякіх дэталяў трагедыі паведаміць таксама не можам..." Яно, з аднаго боку, і зразумела: пакуль дакладна невядома аб сапраўдных прычынах трагедыі, каменціраваць здарэнне наўрад ці варта.

На дадзены момант вядома толькі тое, што Дзмітрый Кавальчук пагружаўся на глыбіню без аквалангa, толькі ў масцы. Вядома таксама, што ён хацеў данырнуць да ям, дзе зімуе рыба. Пакуль ёсць дзве неафіцыйныя версіі трагедыі: альбо Кавальчук заблытаўся ў рыбацкіх сетках і не здолеў выбрацца, альбо дайвер нырнуў вельмі глыбока і яму не хапіла паветра...

Дарэчы, у гэтым жа месцы пяць гадоў таму патанулі трое дайвераў. Іх знайшлі толькі праз месяц.

У Дзмітрыя Кавальчука засталася жонка і непаўнагадовы сын.

Антон ВІТАЛЬЕЎ.

ЧУЛІ?

У Беларусі з'явіцца вайсковая паліцыя

Вайсковая паліцыя можа быць створана ва Узброеных сілах Беларусі. У Міністэрстве абароны нашай краіны лічаць гэты праект мэтазгодным.

Мяркуецца, што вайсковая паліцыя магла б займацца забеспячэннем правапарадку ў войску, прафілактыкай, папярэджаннем і раскрыццём злачынстваў. Да функцыі паліцыі таксама адносяць і пошук дэзерціраў, паведамляе "Інтэрфакс".

Нагадаем, што зараз за парадкам у войску наглядае Генеральная пракуратура з дапамогай свайго падраздзялення — галоўнай вайсковай пракуратуры.

Нямецкія дэпутаты: разведка боем

Дэпутат бундэстага Мары-Луіза Бек патрабуе ад нямецкага ўрада знізіць суму візавых збораў для грамадзян Беларусі. Пра гэта яна заявіла ў інтэрв'ю нямецкаму выданню "Тагесшпігель". М.-Л.Бек таксама выказала меркаванне, што Германія павінна ўзяць за прыклад Францыю і выдаваць бясплатныя візы ўсім беларусам, якія не дасягнулі 25 гадоў.

Дэпутат запатрабавала ад Еўрасаюза "ўзмацніць сваю прысутнасць у Беларусі".

Нагадаем, што М.-Л.Бек на мінулым тыдні знаходзілася з візітам у Беларусі разам з генеральным сакратаром Хрысціянска-дэмакратычнага саюза (ХДС) Германіі Рональдам Пофалам.

Як піша выданне, нямецкія палітыкі "скептычна" паставіліся да слоў Аляксандра Лукашэнкі, які ў інтэрв'ю газеце "Вельт" выказаўся за збліжэнне Беларусі і Еўрасаюза.

"Беларускі ўрад не можа чакаць, што атрымае магчымасць размаўляць з Захадам, калі ён пры гэтым будзе актыўна прыгнятаць апазіцыю, — сказаў Р.Пофала. — Партыям неабходны доступ да незалежных сродкаў масавай інфармацыі, павінны быць вызвалены палітычныя вязні". Пры гэтым ён зазначыў, што з прадстаўнікамі беларускага ўрада сёння "можна гаварыць больш адкрыта, чым яшчэ ў сакавіку мінулага года". На думку генеральнага сакратара ХДС, гэта звязана з нядаўнім беларуска-расійскім энергетычным крызісам.

Таццяна КАРАВЯНКОВА.

ДЫПКУР'ЕР

Беларусы плацяць за польскую візу ў два разы менш, чым расіяне

Аднак ужо ў гэтым годзе Польшча можа ўвайсці ў склад краін Шэнгенскага пагаднення. Колькі тады будзе каштаваць польская віза, невядома.

Затое зараз, з 15 студзеня гэтага года, Амбасада Польшчы ўвяла новыя правілы атрымання візы.

— Цяпер атрымаць візу будзе значна прасцей, — тлумачыць начальнік візавага аддзела Пасольства Польшчы Міхаіл Грачыла, — У любы дзень з панядзелка па пятніцу з 14 гадзін і да 16.30 любы грамадзянін Беларусі можа прыйсці ў консульскі аддзел і асабіста з супрацоўнікамі вызначыць дзень і час, калі яму зручней аформіць дакументы на візу. Звычайна ён атрымлівае запрашэнне прыйсці праз тыдзень. Беларусам прасцей і танней самім, а не праз турфірмы афармляць візы.

Начальнік консульскага аддзела Кшыштаф Свідэрак дапаўняе калегу: "Самая вялікая колькасць жадаючых атрымаць візу назіраецца звычайна ў жніўні, снежні, кастрычніку і чэрвені. Менш людзей звяртаецца да нас у студзені, сакавіку і верасні. Візу можна атрымаць нават за паўгода да плануемай вандроўкі. Можна не чакаць чэрвеня, а ўжо зараз звярнуцца ў консульскі аддзел і атрымаць візу".

Дарэчы, у мінулым годзе польская амбасада ў Мінску выдала 98 тысяч 144 візы. Амаль усе кароткачасовыя. Толькі 4 тысячы беларусаў выязджалі ў Польшчу па справах бізнесу. У асноўным ехалі ў шоп-туры альбо на экскурсіі.

Сёння польская віза для беларусаў каштуе ў два разы танней, чым для расіян. Мы плацім за аднаразовую візу 5 еўра, расіяне — 10, за двухразовую адпаведна 8 і 16 еўра, а шматразовую — 24 і 50. Для жыхароў астатніх краін СНД гэтыя тарыфы яшчэ большыя. Толькі аднаразовая віза ў Польшчу абыходзіцца ім у 36 еўра.

Аднак нашы суседзі — украінцы ўвогуле атрымліваюць польскую візу бясплатна.

Вольга ГРЫНЯВІЦКАЯ.

Народная Воля http://www.nv-online.info
2 ЛЮТАГА 2007 г.

САМІТ

А чаму вас не было на «Балі брэндаў»?

Тым больш што “ўваходны білет” не дарагі, усяго 1 мільён 487 тысяч рублёў. Для вашага прадпрыемства. І ён дае магчымасць пабываць не толькі на гэтым мерапрыемстве, але і ўдзельнічаць ва ўсім прафесійным конкурсе “Брэнд года”, які адкрывае новыя магчымасці.

Далёка не ўсім чытачам дакладна зразумела, аб якой такой важкай справе пачата размова. Таму трохі лікбезу. Хораша сказаў пра брэнд рэдактар аднаго дзелавога расійскага часопіса Андрэй Пуртаў: “Гэта самая моцная эканамічная зброя сучаснага свету, і праводзімы конкурс дапамагае авалодваць ёю”. А калі яшчэ прасцей, дык размова пра таварную марку, яе сімвал, засведчаны практыкай, такі як “Мерседэс”,"Кока-Кола", трактар “Беларус”... Не маючы пацверджанай падобнай рэпутацыі, цяпер цяжка збыць прадукцыю.

Дык вось, удзельнік конкурсу “Брэнд года” атрымлівае падтрымку ў развіцці іміджу свайго брэнда, экспертную ацэнку яго моцных і слабых бакоў, перспектыў развіцця, а таксама мае доступ да вынікаў маніторынгу папулярнасці гандлёвых марак у сваёй галіне, рэкамендацыі па распрацоўцы стратэгіі развіцця брэнда...

Удзельніку конкурсу адкрыты дзверы на карысныя мерапрыемствы. У тым ліку на канферэнцыю “Сусветны вопыт развіцця брэндаў: праблемы і перспектывы”, на саміт дырэктараў, які сёлета ладзіўся ўпершыню. На ім удалося пабываць і нам. Гэта быў, вобразна кажучы, баль-кірмаш ідэй і вопыту лідэраў.

Дык аб чым жа гаварылі лідэры беларускіх прамыслоўцаў?

Спачатку хто, а потым што

Гэты крылаты выраз зляцеў з вуснаў **генеральнага дырэктара СП “Мілавіца” Дзмітрыя ДЗІЧКОЎСКАГА.** У ім — асноўны змест філасофіі кампаніі. Каб дакладна вырашыць, што вырабляць, спачатку трэба стварыць творчую атмасферу ў калектыве. Спецыялісты павінны “ўзнята вышэй зробленага да іх” і акінуць позіркам перспектывы.

Менавіта пасля такога “палёту” на “Мілавіцы” і вырашылі падвоіць выпуск прадукцыі. Бо “палёт” паказаў, што іхні рынак у Расіі вырас за апошнія гады на 60 працэнтаў, а вытворчасць рэчаў па задавальненні яго патрэб знізілася ў восем разоў. Маючы пад бокам такі голы рынак, проста грэх было не замахнуцца на падваенне аб’ёмаў вытворчасці.

Пра што б ні гаварыў кіраўнік “Мілавіцы”, усё зводзілася да гэтага “хто”. У апошнія гады ў рабоце адбыўся зрух ад “плана вытворчасці да плана продажу”. Каб прадаваць, трэба мець вялікі партфель марак, нельга ж да розных кліентаў ісці з адным і тым жа. Ды мець добрую дылерскую сетку. Яна — працяг вытворчасці. Нельга забываць і пра магазіны. І найперш вучыць усіх пагалоўна — работнікаў прадпрыемстваў, дылераў, прадаўцоў магазінаў... Каб былі на ўзроўні патрабаванняў часу. Менавіта сюды, у персанал, ідуць асноўныя інвестыцыі “Мілавіцы”. І гэта дае добры плён. За пяцігодку калектыў падвоіў выпуск прадукцыі, павялічыў яе экспарт. Заробкі працаўнікоў у два разы вышэй, чым па галіне.

Аднак сёлета сітуацыя значна пагоршылася. Выраслі цэны на энерганосьбіты. Расія адной нагой ужо ў Сусветнай гандлёвай арганізацыі. Яе рынак стане адкрытым для іншых краін, значыць, там вырасце канкурэнцыя. А канкураваць з азіяцкімі вытворцамі цяжкавата, бо ў іх вельмі танная рабочая сіла. “Што ж тады рабіць? Тое, што рабілі раней, ужо мала спатрэбіцца”, — гаворыць генеральны дырэктар і выкладае планы.

Калектыў паставіў даволі амбіцыёзныя мэты. Значна павялічыць выпуск прадукцыі. Заўважце, клапоцяцца не толькі аб тым, каб утрымаць сваё значнае месца на рынках у новых, больш цяжкіх умовах, а яшчэ павялічыць яго. Ды знізіць затраты аж на 30 працэнтаў.

Як мяркуецца ажыццявіць намечанае? Павелічэннем долі на завяваных ужо рынках Расіі, Украіны, Казахстана, выхадам на новыя рынкі, найперш краін Балтыі, Цэнтральнай Еўропы. Для чаго пачалі распрацоўваць новыя вырабы і калекцыі з еўрапейскім ўзроўнем дызайну, з прыцягненнем да экспертызы спецыялістаў Францыі і Італіі.

Вядома, што ўвайсці ў гандлёвую сетку Еўропы ой як складана. Ды і “ўваходны білет” туды дарагі. Таму вырашылі купіць там шэраг магазінаў. І танна і сярдзіта. І хутка са сваім таварам да іх пакупніка. Вось што значыць добра пакумекаць.

Так што сапраўды спачатку хто...

Мяняйся ці памры

Такі дэвіз другога выступаючага, **генеральнага дырэктара ЗАТ “Пінскдрэў” Лорана АРЫНІЧА.** Ён кажа: “Мяняйся ці памры — лозунг лідэраў”. Гэта і іх лозунг. А філасофія кампаніі ўключае яшчэ і дзелавы стыль, і пастаяннае ўдасканаленне тэхналогіі.

Асноўныя інвестыцыі тут — у навучанні кадраў і стажыроўцы іх. На прадпрыемстве выпрацавана сістэма матывацыі. Штогод праводзяцца конкурсы на званне лепшага, у калектыве, шмат працоўных дынастый, больш сарака. Трэцяя частка працуючых — моладзь. Словам, сплаў вопыту і маладосці.

Другі паток інвестыцый — у пастаяннае пераўзбраенне вытворчасці. Дарэчы, за пяцігодку аб’ём іх вырас у некалькі разоў. Мяняецца ўсё — і станкі, і людзі.

Яны, інвестыцыі, з’явіліся ад добрых вынікаў працы. За пяцігодку “Пінскдрэў” падвоіў аб’ём вытворчасці, патроіў экспарт сваіх вырабаў. Больш за трэць экспарту ідзе ў Расію, 15 працэнтаў — у Германію, 4 — у Бельгію, 3 працэнты — у Венгрыю... На ўнутраным беларускім рынку запалкі “Пінскдрэва” займаюць 44 працэнты, ДСП — 26 працэнтаў, мэбля — 15 працэнтаў.

Бяруць не толькі колькасцю, але і якасцю. Пінскай мэбляй аснашчана Нацыянальная бібліятэка Беларусі. Пастаўляецца яна і ў мінскую гасцініцу “Еўропа”.

“Пытаюць: ”Ці выжывем у новых умовах?" Мы пра гэта падумалі даўно. У свой час пабудавалі кацельні, у якіх спальваем адыходы", — кажа кіраўнік “Пінскдрэва”. Іх сакрэт і сённяшняя надзея — шырокі асартымент вырабаў ды пабудаваная дылерская сетка. Тут вырабляюць і мэблю, і ДСП, і фанеру рознай таўшчыні, і запалкі, і піламатэрыялы... Словам, ёсць што прапанаваць пакупніку.

І прапаноўваюць свае вырабы штогод на так званых дамашніх выставах. Іх ладзяць ужо сёмы год і запрашаюць на выставы не толькі пастаянных пакупнікоў, але і патэнцыяльных.

Словам, мяняюць і мяняюцца пастаянна.

Byfly (Байфлай!)

Намеснік генеральнага дырэктара РУП “Белтэлекам” Ірына ПАДАБЕД падзялілася вопытам вываду на рынак новай гандлёвай маркі Byfly.

Каб пашырыць сваю прысутнасць на рынку, у “Белтэлекаме” вырашылі “пайсці на прарыў” — прапанаваць спажыўцам так званы шырокапалосны доступ у Інтэрнет, ці хуткі Інтэрнет. Вядома, гэта запатрабавала мадэрнізацыі сеткі, яе тэхнічнага пераўзбраення. Але найперш варта было зацікавіць патэнцыяльных спажыўцоў. Значыць, пачаць прасоўваць яркі брэнд. Вось толькі як яго назваць?

Ад назвы ой як многа залежыць. Як тут не нагадаць гісторыю з брэндам “Савушкін прадукт”. Спярша спецыялісты Брэсцкага малочнага камбіната хацелі назваць новую гандлёвую марку “Бярэсце”. Але потым спахапіліся, што не дужа арыгінальна. Больш таго, прадукцыю пад такой назвай сёй-той ужо выпускаў. А хацелася штосьці новага, прывабнага. Падключылі да пошуку рэкламныя агенцтвы і студэнтаў. І з многіх назваў выбралі гэту — “Савушкін прадукт”. І не памыліліся. Новы брэнд хутка прыцягнуў увагу сваёй нейкай свойскасцю, і пачаў заваёўваць рынак.

Вось так творча падышлі і ў “Белтэлекаме”. Вырашылі, што ў назве павінен быць дамашні штрых. У свеце камп’ютэраў Беларусь — гэта by. Па-другое, у назве брэнда павінен быць адлюстраваны галоўны змест прадукта. А ён быў такі — хутка, хуткі Інтэрнет. Адсюль і ўзялося слова fly, што азначае лятаць. Так нарадзілася марка Byfly. Новая і незвычайная.

Цяпер засталося данесці яе да спажыўцоў. Распрацавалі ёмкі слоган з трох “лёгка” — лёгка падключыцца, лёгка карыстацца, лёгка сабе дазволіць. Зрабілі ролік для тэлебачання — на экране з будынка ў будынак хутка ляцяць пісьмы і гучаць словы: “У гэтым свеце так лёгка лятаць з Byfly”. Следам пачалі акцыю: “Большы аб’ём за меншую цану”.

***

І гэта толькі кароткія нататкі, толькі з самміта дырэктараў. А ўяўляеце, што было на “Балі брэндаў”, на астатніх мерапрыемствах? Не шкадуеце, што прапусцілі?

Алесь ДРАБЧУК.

Самагонныя заводы

Тры тоны брагі і міні-завод па вырабе самагону знішчаны ў Кобрынскім раёне. Пра гэта БелаПАН паведамілі ва ўпраўленні прафілактыкі УУС Брэсцкага аблвыканкама. Выраб самагону быў наладжаны ў лясным масіве непадалёк ад вёскі Барысаўка.

На “працоўным месцы” былі затрыманы 45-гадовы жыхар вёскі Клятышча, 42-гадовы жыхар пасёлка Дзівін і 27-гадовы жыхар вёскі Барысаўка.

Варта зазначыць, што гэта ўжо чацвёрты падпольны мінізавод па вырабе самагону, знішчаны сёлета ў Кобрынскім раёне. Тры былі выяўлены непадалёк ад пасёлка Арэхаўскі. За мінулы год на тэрыторыі раёна было выяўлена 13 такіх вытворчасцяў.

Ларыса ШЫГАНАВА.

Батура в гневе

На заседании Могилевского облисполкома подведены итоги работы области в минувшем году. Итоги оказались далеко не веселыми.

На заседании было отмечено, что 22% предприятий допустили спад продукции, а половина районов не достигли прогнозных показателей, в частности, не выполнили планы по вводу жилья. В связи с этим глава облисполкома Борис Батура предложил освободить от должности девять заместителей председателей райисполкомов по сельскому хозяйству.

Конструкторы МТЗ создали пылесос для улиц

Еще в прошлом году Минский тракторный завод поставил свой рекорд, выпустив более 50 тысяч тракторов и машин, войдя в тройку лидеров всего мира. В 2007-м планка выше — выпустить еще больше техники и обязательно удивить новинками. И уже есть чем.

На заводе подготовлена вся документация к выпуску новой машины, так называемой вакуумно-уборочной, или попросту “дорожного пылесоса”. Она предназначена для уборки как тротуаров и дворов от пыли, мусора и снега, так и больших магистралей столицы. Аналоги этакого конструктора “лего” для взрослых уже разра-

Увага, новыя цэны!

Новыя тарыфы на паслугі жыллёва-камунальнай гаспадаркі ўстаноўлены пастановай беларускага ўрада. Тарыфы на газ і электрычнасць для насельніцтва ўзраслі на 20%, цеплавую энергію — на 12%. Дзейнічаюць яны папярэднім чыслом — з 1 студзеня.

Электраэнергія будзе каштаваць 112,1 рубля за 1кВт/гадзіну. У кватэрах, абсталяваных электраплітамі, гэтая лічба складае 81,2 рубля за кілават/гадзіну. Газ у жылых дамах і кватэрах, дзе ўстаноўлены лічыльнікі, у ацяпляльны сезон будзе каштаваць 141 рубель за кубічны метр, а ў летні перыяд — 242 рублі.

У дамах і кватэрах без індывідуальных лічыльнікаў газу пры наяўнасці газавай пліты і цэнтралізаванага гарачага водазабеспячэння людзям давядзецца выкласці 1936 рублёў у месяц за аднаго чалавека.

Ул.інф.

СЛЫШАЛИ?

В обход

Минпромэнерго России энергично восприняло слова Владимира Путина о том, что его стране необходимо избавляться от энергетического “паразитизма”, и слова Александра Лукашенко о том, что его страна в свою очередь будет использовать свое положение транзитера в собственных интересах, сообщает Neftegaz.RU.

Исходя из этого, министерство рассматривает вопрос о целесообразности строительства тысячекилометрового нефтепровода мощностью 50 млн тонн нефти в год, который пройдет по маршруту “Унеча — Великие Луки — Приморск” в обход Беларуси.

Другим предложением о снижении зависимости России от Беларуси как транзитера, является возможное увеличение поставок нефти на Киришский НПЗ до 24 миллионов тонн в год с последующей отгрузкой через Приморск. Варианты увеличения загрузки завода — такие как строительство отвода от планируемой системы или рост поставок из нефтепровода “Ярославль — Кириши — Приморск” — сейчас также рассматриваются Минпромэнерго.

ОСТРЫЙ ВЗГЛЯД

Неужели Чернобыля мало?

После чернобыльской трагедии в Беларуси даже не заикались о возможном строительстве атомной станции. Но недавно практически принято решение о ее возведении. Александр Лукашенко в целом одобрил предложения Национальной академии наук и правительства по строительству в стране атомной электростанции. Чем же аргументируется такое решение? Может, АЭС стали безопасными? Как к ним относятся в мире? Давайте поищем ответы на эти вопросы.

Выход из энергетического кризиса?

На совещании по вопросам повышения энергетической безопасности Беларуси Александр Лукашенко подчеркнул, что в складывающейся ситуации с энергоресурсами вопрос о создании собственной ядерной энергетики становится практически безальтернативным вариантом гарантии национальной безопасности Беларуси и условием обеспечения страны дешевой энергией.

По его словам, ученые и специалисты на общем собрании Национальной академии наук Беларуси единогласно высказались за строительство атомной электростанции в стране. *“Это аргументированная и взвешенная позиция. Ученые исходили не только из наших внутренних потребностей в энергии, но учли весь мировой опыт, который свидетельствует, что в будущем ядерная энергетика станет основным средством преодоления глобального энергетического кризиса”*, — сказал Лукашенко.

Александр Григорьевич не исключает, что Беларусь в будущем может столкнуться с проблемой нехватки углеводородного сырья в России — у своего главного поставщика. *“На переговорах с Владимиром Владимировичем Путиным мы обсуждали проблемы дефицита углеводородного сырья в самой России, откуда Беларусь получает газ, нефть, уголь. Поэтому мы можем оказаться перед фактом, когда Россия и при желании поставлять нам углеводородное сырье не сможет это сделать, потому что у нее не будет его хватать”*, — сказал глава государства. Поэтому строительство АЭС в Беларуси рассматривается как вариант диверсификации источников энергоресурсов.

Глава государства выразил уверенность в том, что при подробном и полном информировании народа Беларуси о ситуации в энергетической сфере и перспективах развития республики люди согласятся с позицией руководства страны и поддержат ее. При этом он особо подчеркнул, что если в Беларуси будет принято решение о строительстве атомной электростанции, то проект и технология реактора должны отвечать самым современным и жестким требованиям безопасности.

На совещании были рассмотрены возможные варианты места размещения АЭС, сроков строительства, источников финансирования. По итогам обсуждения в качестве места для строительства АЭС предпочтение было отдано Краснополянской площадке в Чаусском районе Могилевской области. Однако окончательное решение будет принято по результатам геологических и экологических исследований, сейсмо- и тектоникопоказателей. Вместе с тем актуальным остается и вариант размещения станции у западных границ.

Следует заметить, что Лукашенко коснулся и чернобыльской темы. Он сказал, что Беларуси вряд ли стоит игнорировать мировые тенденции и культивировать в сознании белорусов радиофобию и постчернобыльский синдром. *“Коль в Европе и у наших ближайших соседей активно развивается атомная энергетика, то и нам в этом плане отставать нельзя”*, — добавил он.

А на совещании на новополоцком “Нафтане” он назвал строительство атомной станции “нашим спасением”.

А ЧТО СЛЫШНО В МИРЕ?

Опасен — не опасен...

Итак, что же слышно об этом в мире? Действительно ли там активно развивается атомная энергетика?

В мире не утихают дискуссии. Сторонники и противники атома, похоже, не смогут достичь компромисса.

“Интерес к атомной энергетике как раз обясняется тем, что она безопасна”, — сказал в интервью BBCRussian.com вице-президент российской компании “Атомстройэкспорт” Евгений Решетников. Представители атомной индустрии утверждают, что они вовсе не забыли Чернобыль, но вынесли из него необходимые уроки. *“В Чернобыле произошло наложение человеческого фактора на тип реактора, современные же реакторы имеют тройную степень защиты”*, — утверждает он.

Однако сопредседатель международной экологической группы “Экозащита” Владимир Сливяк замечает, что ни один атомный реактор не может быть на 100% безопасен. Причем даже современные ВВЭР-1000 имеют недостатки: не исключена ситуация, при которой охлаждающая реактор вода может вытечь, он перегреется и взорвется.

Сейчас 440 атомных реакторов в 31 стране мира вместе производят около 370 ГВт электроэнергии. Это почти в два раза больше, чем все производство электро- и тепловой энергии в России. Самая “ядерная” страна сегодня — Литва: 80% ее энергетики обеспечивается за счет расщепления атома. Но если в бывшей советской республике просто не нашлось других сильных производств, то настоящий лидер индустрии — Франция. Французы вырабатывают на АЭС 78% своей энергии и являются самыми крупными ее экспортерами.

Украина, например, не просто хочет добавить четыре-пять энергоблоков к действующим на ее территории 15-ти, но и подумывает о замкнутом цикле обработки ядерного топлива. Россия за счет реконструкции и строительства новых реакторов планирует увеличить к 2020 году свои мощности в два с половиной раза до 50 ГВт с нынешних 21ГВт. Южная Корея и Китай собираются построить по восемь новых реакторов, Япония — 12. Задумывается о первом совместном предприятии и Вьетнам.

Турция уже подобрала места для строительства АЭС, но затем отложила этот проект на неопределенное время. Германия — основной покупатель российского газа — несколько лет назад приняла решение свернуть ядерную программу. Несмотря на требования ряда немецких компаний пересмотреть “ядерную паузу”, министр по охране окружающей среды заявил, что этому не бывать. Большинство жителей этой страны видит в атомной энергетике большую опасность. По результатам последнего социологического опроса, так считает 51 процент населения. Опрос в августе 2006 года, вскоре после чрезвычайного происшествия на АЭС в Швеции, провел институт Forsa по заказу федерального министерства защиты окружающей среды. Тогда 62 процента респондентов заявили, что темпы закрытия электростанций должны быть сохранены или даже ускорены. Лишь 18 процентов считают неправильным отказ от атомной энергии.

Еще в 1997 году Швеция приняла акт, позволяющий правительству закрывать АЭС, компенсируя расходы владельцам станций. С тех пор правительство и компании находятся в противостоянии, которое не помешало властям закрыть один из реакторов в мае 2005 года.

Основные доводы против атомной энергетики — сомнения относительно ее безопасности, проблема утилизации ядерных отходов, а также угроза распространения атомного оружия. При этом нежелание населения соглашаться на размещение этого производства у себя под боком — главный фактор, сдерживающий развитие этого типа энергетики. Основным критическим моментом в экономике АЭС всегда были высокие расходы на их строительство.

“Атомная энергетика так же потенциально опасна, как и любое техногенное производство. Дураков только не надо допускать к атомной энергетике. На станциях должны быть не только квалифицированные сотрудники, но и жесткий контроль”, — говорит вице-президент московского “Курчатовского института” Николай Пономарев-Степовой. *“Абсолютной защиты от дураков нет”*, — возражает ему руководитель энергетического отдела "Гринпис Россия" Владимир Чупров. *— Так, в России ситуация сейчас хуже, чем в чернобыльские и постчернобыльские времена: проблемы алкоголизма, воровства и коммерциализации отраслей, сопровождающие нашу повседневную жизнь, в ядерной энергетике становятся поводом для невроза”*. По его словам, лишь за два года и лишь на Ленинградской АЭС произошло два настораживающих случая.

Специалисты не согласны и с утверждениями о дешевизне атомной энергии. Они ссылаются на Францию и Грецию. Первая имеет много атомных станций, вторая — ни одной. Так вот, энергия Франции намного дороже, чем в Греции.

Еще один довод противников атомной энергетики — угроза терроризма. По словам Владимира Чупрова, в феврале 2000 года его группе удалось беспрепятственно проникнуть на крышу хранилища отработанного ядерного топлива, затем ФСБ провело аналогичную проверку и заложило на крышу муляжи мин, однако отношение персонала к физической безопасности на хранилище не изменились.

Экологические организации заявили, что Организация Объединенных Наций пытается преуменьшить последствия аварии на Чернобыльской атомной электростанции, пытаясь убедить мир в безопасности ядерной энергетики.

У мінулым годзе Дзяржстандарт Беларусі праверыў 2300 узораў прадуктаў, і амаль у 140 пробах (у спісе пельмені, вяндліна, прыправы, супы, локшына хуткага гатавання, блінчыкі) знойдзены генетычна мадыфікаваныя элементы.

У інтэрв'ю Радыё Свабода загадчык лабараторыі комплексных праблем харчавання Рэспубліканскага цэнтра гігіены і эпідэміялогіі Васіль Цыганкоў сказаў, што выяўлена была соя, якая ўтрымліваецца ў варанай каўбасе альбо кукурузе. *"Калі б было дакладна даказана,* — сказаў Цыганкоў, — *што, да прыкладу, генетычна мадыфікаваная соя наносіць шкоду чалавеку, калі б гэта Еўрапейскі Саюз ці Сусветная арганізацыя аховы здароўя вызначылі, дык гэта было б забаронена ва ўсім свеце. Але пакуль нічога не даказана. Таму як можна казаць пра шкоднасць?"*

Дарэчы, у Беларусі ў кожным абласным горадзе пры цэнтрах гігіены і эпідэміялогіі створана адпаведная лабараторыя, дзе даследуюцца ўсе прадукты, якія трапляюць у Беларусь з-за мяжы. Але гэта зусім не азначае, што калі прадукт утрымлівае генетычна мадыфікаваныя (ГМ) элементы, яго забараняюць. Згодна з законам "Аб біябяспецы", на ўпакоўцы такіх прадуктаў павінна быць адпаведная маркіроўка.

Беларускія эколагі доўгі час дабіваюцца, каб у нашай краіне была замацавана такая норма, як у Малдове: калі ў прадукце ёсць ГМ-элементы, 10% плошчы этыкеткі павінен займаць надпіс пра гэта. І каб, як на цыгарэтах, было папярэджанне. Але пакуль такая норма не дзейнічае. Затое Міністэрства аховы здароўя зацвердзіла спіс прадуктаў, якія абавязкова павінны правярацца. У першую чаргу гэта соя, кукуруза, рыс, бо ў свеце большая частка гэтых прадуктаў трансгенная.

Зміцер ГАЛУШКА.

Народная Воля http://www.nv-online.info
2 ЛЮТАГА 2007 г.

АНОНС

Разминка перед сольником

Недавно участникам группы “Тяни-Толкай” пришлось оправдывать собственное название.

У артистов, которые возвращались с гастролей по Могилевской области, закончился бензин в автобусе. Несмотря на весьма нелетнюю погоду “тянитолкаевцы” — **Павел Клышевский, Андрей Заяц, Павел Тараймович и Кирилл Клишевич** повели себя как настоящие джентльмены.

“Автобус заглох очень удачно — не очень далеко от автозаправки, поэтому толкать пришлось не много, — говорит Павел Клышевский. — *Хотя мы шутили, что если нужно, то можно и до Минска дотолкать: осталось всего тридцать пять километров”.*

*“Так получилось, что с нами ехали в основном девушки — **Улялюм, Вера Каретникова**, танцовщицы. И на улице было очень холодно, поэтому мы предложили представительницам прекрасной половины остаться в автобусе, а сами стали толкать”,* — рассказывает Кирилл Клишевич.

Кстати, сейчас группа “Тяни-Толкай” вовсю готовится к большому сольному концерту, который состоится ***19 февраля*** во Дворце Республики.

Проста каханне ад Іскуі Абалян

13 лютага да Дня ўсіх закаханых у Палацы Рэспублікі — аўтарскі праект спявачкі Іскуі Абалян “Гэта проста каханне”.

У канцэрце прымаюць удзел **Аляксей Хлястоў, Іна Афанасьева, Аляксандр Ціхановіч і Ядзвіга Паплаўская, Пётр Ялфімаў, Алеся, “Тяни-Толкай”, Алена Грышанава, Віктар Пшанічны, Вольга Плотнікава, Ганна Шаркунова, Паліна Смолава, група “Беларусы”,** а таксама **Ксюша Каліна** і **Анатоль Ярмоленка-малодшы.**

Кошт білетаў — ад 10 да 29 тысяч беларускіх рублёў.

ПЕРСОНА

Тысяча і адна ноч пружанскай прыгажуні

Гэтая дзяўчына цалкам падыходзіць пад вызначэнне self made man, што ў перакладзе з англійскай мовы азначае — чалавек, які зрабіў сябе сам. Аб кар’еры мадэлі мараць дзесяткі тысяч дзяўчат. Аднак узысці на алімп мадэльнага бізнесу ўдаецца адзінкам.

Вось і юная пружанская дзяўчынка Каміла наўрад ці магла сабе ўявіць, што стане адной з самых вядомых мадэлей. І не дзе-небудзь, а ў краіне пірамід і фараонаў — у далёкім і сонечным Егіпце.

— Ведаеш, я і думаць не магла, што стану мадэллю, — гаворыць Каміла. — Як гэта часта бывае ў жыцці — дапамог выпадак. Тры гады таму я паехала ў Егіпет адпачываць. Там у мяне завязаліся знаёмствы, а Егіпет так спадабаўся, што я вырашыла: застаюся. Потым трэба было ўладкавацца на новым месцы, знайсці працу. Што я і зрабіла.

— І як на нечаканы паварот у тваім жыцці адрэагавалі бацькі? Усё ж такі Егіпет — не блізкі свет. Напэўна ж, родныя хваляваліся?

— Напачатку маці ўгаворвала вярнуцца ў Беларусь. А потым сказала: “Калі ты выбрала гэты шлях, то па ім і ідзі. Калі табе будзе добра, то і мне будзе таксама добра”. Хаця я рэгулярна наведваю Беларусь. З цягам часу думаю канчаткова вярнуцца на Радзіму. Я ўпэўнена, што чалавек павінен жыць на Радзіме. Што называецца, “дзе нарадзіўся, там і згадзіўся”. Так што егіпецкі перыяд майго жыцця — не назаўжды.

— Па нашым тэлебачанні пастаянна паказваюць ролікі, якія папярэджваюць дзяўчат: за мяжой ёсць рызыка трапіць у сексуальнае рабства. Ты не баялася гэтага?

— Шчыра адкажу, не. Я ведала куды і да каго еду — у Егіпце жыве мая добрая сяброўка, таму я нават і не парылася на гэты конт. Зараз знаходжуся ў Егіпце па працоўнай візе.

— Узыходжанне да вяршынь мадэльнага бізнесу ты пачынала ў Каіры. Зараз цябе ведае ўвесь Егіпет. З чаго пачынаўся твой шлях у мадэльны бізнес? Напэўна, у цябе ёсць уладарны апякун?

— Ай, кінь ты! Ніякага ўладара ў мяне няма. Я прызвычаілася ўсяго дабівацца ў жыцці сама. Колькі сябе помню — увесь час любіла фатаграфавацца. Таму і вырашыла папрацаваць у якасці мадэлі. Тут дапамог выпадак. Мне прапанавалі маленькую ролю ў фільме “Тысяча і адна ноч”. Актрыса, якая павінна была яе выконваць, упала з каня. А муж маёй сяброўкі звязаны з тамашняй кінаіндустрыяй. Мяне выклікалі на пробы і зацвердзілі на ролю. Вось так усё і распачалося.

— Яшчэ адной праблемай, з якой сутыкаюцца эмігранты, — моўны бар’ер. Англійская мова, яшчэ туды-сюды. А вось арабская, відаць, вельмі складаная. Як ты яе спасцігала?

— Каб вывучыць мову, на якой размаўляюць егіпцяне, мне спатрэбіўся год. Зразумела, гэта толькі размоўны варыянт. Чытаю я на арабскай вельмі дрэнна. І калі па тэлебачанні размаўляюць на класічнай арабскай мове, то разумею не ўсё. А ўвогуле я схільная да вывучэння моў. Свабодна валодаю англійскай і нямецкай мовамі. Мне падабаецца ўсё новае і незнаёмае.

— Ведаю, што акрамя кар’еры мадэлі ты актыўна займаешся ў Егіпце шоу-бізнесам...

— Мая кар’ера спявачкі толькі ў самым пачатку. Распачыналася ўсё прыкладна год таму. Мясцовы прадзюсер заўважыў мяне, мы вырашылі запісаць песню і зняць на яе кліп. На першую кампазіцыю былі вельмі добрыя рэцэнзіі.

Шчыра кажучы, у сваю раскрутку я ўкладваю грошы, якія зарабляюцца ў мадэльным бізнесе. У Егіпце мяне добра ведаюць як мадэль. Я з’яўляюся адной з самых высокааплачваемых мадэляў у краіне пірамід і фараонаў. Рэгулярна ўдзельнічаю ў паказах, здымаюся для часопісаў. Мне падабаецца падабацца. А вось як спявачку мяне ведаюць менш. Зараз перада мной мэта — стаць першай беларускай артысткай, якая спявае песні на арабскай мове.

— А што ўяўляе сабой егіпецкі шоу-бізнес? Стэрэатыпы еўрапейцаў складаюцца прыкладна вось з чаго: уладальнікі нафтавых скважын прадзюсіруюць сваіх фаварытак, даючы ім грошы на песні і адорваючы брыльянтамі...

— Гэта толькі стэрэатыпы. Сённяшні Егіпет — даволі еўрапеізаваная краіна. Людзі апранаюцца па-еўрапейску, уклад жыцця ў іх падобны на наш. І шоу-бізнес там такі ж, як і ў Беларусі — кагосьці ведаюць лепш, кагосьці горш. Усё залежыць ад саміх спевакоў. Такіх, каго ведае ўся краіна, — дзесяткі тры набярэцца. Яны выступаюць з сольнымі канцэртамі, іх запрашаюць на вечарынкі. Я таксама выступаю ў разнастайных “салянках”. Дарэчы, егіпцяне заўважаюць, што я спяваю з акцэнтам. Праўда, кажуць, што ён у мяне даволі мяккі і прыемны вуху.

— А застацца ў Егіпце, стварыць там сям’ю, жадання няма?

— Застацца не хачу. А наконт сям’і...

Мне здаецца, што ў Егіпце ў жанчыны правоў больш. Калі муж на яе не звяртае ўвагі, яна можа паскардзіцца муле, які правядзе “выхаваўчую размову”. І павер мне, гэта ўздзейнічае. Там жанчыны самадастатковыя — яны не стаяць ля пліты ў паранжы. Яны цалкам раўнапраўныя ў сваіх правах з мужчынамі. Патрыярхат — чарговы стэрэатып.

— Каміла, а нашых у Егіпце шмат?

— Егіпет — краіна-курорт. Там часцяком бываюць славяне. Дарэчы, адрозніць іх у натоўпе даволі проста. Яны зімой пры $+20^0$С у адных трусах па Каіру ходзяць. Мясцовыя жыхары сабе гэтага не дазваляюць, хоць неяк апранаюцца. Больш за тое, у гатэлях персанал не англійскую, а рускую мову вывучае. Каб зразумець, чаго хоча большасць турыстаў...

— Каміла, ты выглядаеш цалкам паспяховай дзяўчынай. І ўсё ж такі: чаго табе не хапае ў жыцці? Чаго хочацца?

— Маміных бліноў *(Смяецца. —* **Аўт.***).* А калі сур’ёзна, то мне падаецца, што я толькі ў самым пачатку шляху. Ёсць запаветная мара — хачу стаць вядомай спявачкай. Спачатку ў Егіпце, а потым і тут — у Беларусі...

Віталь ГАРБУЗАЎ.

ЧАСТНАЯ ЖИЗНЬ

Романтик Наумов стесняется женщин

Женское счастье, по утверждению певицы Татьяны Овсиенко, — был бы милый рядом. А мужское счастье, по мнению министра внутренних дел Владимира Наумова, заключается в детях.

На вопрос “Считаете ли вы себя хорошим отцом?” Наумов отвечает мудро: “Не мне судить. Об этом должны говорить дети”.

Кстати, у Владимира Наумова их двое — сын и дочь.

“Но, к сожалению, у меня на них не всегда хватало времени, — признался министр ”Народной воле". — А вот внуки для меня намного ближе. Во всяком случае теперь я могу уделить им больше внимания".

Несмотря на огромную занятость, свою супругу без внимания министр никогда не оставлял.

О своей личной жизни он недавно поведал со страниц ведомственной газеты “На страже”. Вот лишь некоторые отрывки из его супероткровенного интервью.

О родителях

“Мой отец 21-го года рождения, восемнадцатилетним призывался в армию, — *рассказал министр внутренних дел.* — Связистом прошел всю Великую Отечественную войну, и только в 1947-м, после разгрома Японии, старший сержант Наумов вернулся домой, в Смоленск. Бережно храню его фотографию из далекого 43-го года. У отца много боевых наград. Не знаю почему, но он никогда не говорил о войне. Мальчишкой приставал к нему с расспросами о войне. Он отвечал: знаешь, война такое грязное дело, что про нее даже вспоминать нельзя. И я видел, как у него сразу менялось настроение. Единственный раз в жизни он мне рассказал, за что получил медаль ”За отвагу"...

Отец Владимира Наумова трагически погиб. Его хоронили в день рождения сына. Владимиру Наумову тогда было 15 лет.

О детстве

“Когда был еще совсем пацаном, у меня кличка была Комбриг, — *вспоминает Наумов.* — Меня очень ругали, я постоянно играл в войну и всех соседских мальчишек на это дело подбивал. Взрослые жаловались, что кур распугиваем, идя в наступление или отступая с позиций, плохие слова при этом говорим. Еще своей первой учительнице перед всеми заявил: ”Мария Павловна, я обязательно буду пограничником и, когда в первый отпуск приеду, привезу вам эдельвейсы". Пограничник у меня, наверное, по фильмам, ассоциировался с этими цветами.

Но моя голубая мечта не сбылась. В классе девятом появились проблемы со зрением. И я понял, что не удастся поступить в военное училище. Но о другом не мечтал...

О любви

“Впервые влюбился в третьем классе, хорошо помню, — *признается Владимир Владимирович.* — После того, как нас приняли в пионеры, мы пошли в кино, и вот, когда погас свет, я первый раз в жизни попробовал дотронуться рукой до той девочки, которая мне нравилась. Мне казалось, я люблю... В классе седьмом она переехала в другой район (ее отец был прокурором). И до сегодняшнего дня, хотя даже не представляю, как она нынче выглядит, думаю, это была одна из лучших девочек. Да, первая любовь самая-самая светлая...

...Я не очень коммуникабельный человек даже по отношению к мужчинам, а женщин всю жизнь стесняюсь. Это, наверное, и отпечаток того, что тридцать лет работаю с мужчинами... Могу в душе какие-то чувства питать к представительницам противоположенного пола. Но чем больше мне будет нравиться конкретная женщина внешне, по каким-то другим признакам, тем сложнее мне будет общаться с ней, тем больше буду стесняться. И вообще я стараюсь где-то уходить от общения с ними. Мне и сейчас очень-очень сложно с теми же женщинами-руководителями, которые служат в системе МВД, потому что... ну я не умею с ними общаться".

На вопрос: “Если мужчина не может прожить жизнь с одной-единственной женщиной — в этом его слабость или сила?” Наумов ответил так: “У меня тоже по-разному складывалось в жизни, но... сила мужчины все-таки в обязательствах перед своими детьми. Даже не перед... не верю, что можно сохранить любовь в том первоначальном виде на протяжении очень длительного времени. Если это даже и была самая светлая любовь, она в какие-то другие чувства — хорошие, но другие — перерастает.

В возвышенную любовь на всю жизнь не верю. Может быть, это интервью будет читать и моя супруга, у нас так не получилось, но мы считаем: наши чувства друг к другу сегодня намного лучше, чем были тогда, в начале.

А прожить... Случались периоды, когда наши отношения были достаточно сложными. Возможно, иногда я был ближе к детям. Но не представляю, что они могли бы расти без нас двоих.

Знакомые не дадут соврать, я всегда считал, сперва подсознательно, — в жизни есть только основной аэродром и все посадки на запасных площадках недопустимы. Жизнь утвердила меня в этом убеждении. Когда получал тяжелые травмы или ранения, видел, как первые две-три недели всем ты нужен, а потом наступает момент, когда кроме своей семьи, и в первую очередь жены, ты не нужен никому. Это дало мне стопроцентную уверенность в том, что идти по жизни надо с одним человеком. И, может быть, еще раз говорю, не может быть, а точно — с возрастом ты будешь становиться все счастливее и счастливее".

О еде

“Я совершенно не привередлив в еде, — *говорит Наумов.* — Думаю, вкусовые пристрастия, они с детства. Вспоминаю — идешь летом в лес, берешь соленое сало, яичко вареное и огурчик, помидорку с кусочком хлеба. В зимнее время ничего не могло быть лучше картофеля, тех же соленого огурца, жареного яичка. И для меня это навсегда останется эталоном вкусного..."

О публичности

“Сегодня мне достаточно сложно, допустим, сходить в магазин, — *делится подробностями личной жизни генерал.* — Меня обязательно узнают, чувствую и мне неудобно, как у меня за спиной люди шепчутся, обсуждают, что я купил и зачем...

О хорошей физической форме

“Чтобы проснуться утром, я обязательно должен сделать зарядку, — *говорит генерал.* — Два-три раза в неделю играю в хоккей, ежедневно стараюсь прошагать не менее 15—20 километров. Раньше каждое утро просыпался в пять утра и проходил до 7—12 километров, потом завтракал и ехал на работу. Последние три года чуть позже сплю, где-то до половины шестого, но потом пешком иду на работу. Сегодня и домой отправляюсь пешком, и обязательно в обед, с часу до двух, должен размяться”.

Об идеалах

“Я по натуре романтик, — *говорит министр.* — Верю в светлые идеалы, пусть даже некоторые сто раз пробовал проверить и ни разу не получилось”.

Даша ПАВЛОВСКАЯ.

АНОНС

Хто стане рок-князёўнай?

25 лютага ў Канцэртнай зале “Мінск” будуць абвешчаны рок-героі мінулага года.

Рок-кароны атрымаюць пераможцы 12 намінацый. Таксама будзе названы ўладальнік галоўнай “Рок-Кароны”.

Нагадаем, што мінулая “Рок-каранацыя” многім запомнілася з’яўленнем у зале экс-кандыдата ў прэзідэнты Беларусі **Аляксандра Мілінкевіча**, з-за чаго мерапрыемства, на думку некаторых, ледзь не ператварылася ў палітычную акцыю. Напрыклад, даволі папулярная сёння група ***“J-Mors”***, якая перамагла ў адной з намінацый, адмовілася выходзіць на сцэну.

Аліна ВЕТРАВА.

Праспявайце «Песні Свабоды»

Незалежны лэйбл VoliaMusic рыхтуе выпуск музычнага альбома “Песні Свабоды 3".

Дыск складуць у першую чаргу творы, народжаныя падзеямі на Кастрычніцкай плошчы ў сакавіку 2006 года. Сярод іх — “Крывавы сакавік”, “Памяці намётаў” Андрэя Хадановіча, інструментальная кампазіцыя “Плошча Каліноўскага” гурта “Без білета” ды іншых.

Будучым слухачам рэкамендуюць падпісацца на дыск, бо ягоны тыраж будзе абмежаваны. Для гэтага трэба даслаць свае каардынаты на адрас pesni3@tut.by.

Плануецца таксама, што кампазіцыі новых “Песняў Свабоды” будуць даступныя для спампоўвання на сайце za-svabodu.org.

ПРЭМ’ЕРЫ

«Вераб’іная ноч» Аляксея Дударава

На мінулым тыдні Драматычны тэатр беларускай арміі парадаваў гледачоў новай прэм’ерай.

П’есу “Вераб’іная ноч” напісаў драматург і мастацкі кіраўнік тэатра **Аляксей Дударaў** па матывах апавядання **Уладзіміра Караткевіча** “Паром на бурнай рацэ”.

Вераб’іная ноч (або рабінавая, як яе таксама называюць на Беларусі) — гэта ноч напрыканцы лета, калі ўсё неба палыхае, вецер, бура, а грому не чуваць. Дударaў сцвярджае, што ў мінулым годзе ён такое назіраў, выехаўшы за горад, недзе 21—22 жніўня.

На пастаноўку тэатр атрымаў ад Фонду прэзідэнта па падтрымцы культуры і мастацтва 20 мільёнаў рублёў, і, па словах Дударава, у гэтыя сродкі здолелі ўкласціся.

Гэта ўжо чацвёртая прэм’ера Драматычнага тэатра беларускай арміі. Як пачаў ён у 2004 годзе з “цяжкіх” спектакляў *(“Ты помніш, Алёша”, “Не пакідай мяне”, “Рамэо і Джульета”),* так і працягвае. І **Аляксей Дударaў,** і рэжысёр тэатра **Марына Дударава** (дарэчы, ніякіх роднасных сувязяў між імі) адзначаюць, што сярод трупы і нават у іх саміх пачынае з’яўляцца стомленасць. Трагедыя павінна быць у кожным тэатры, аднак нядобра, калі рэпертуар складаецца толькі з гэтага. Дударaў пабяцаў: *“Наступнай прэм’ерай абавязкова будзе камедыя. Але мы такі тэатр, што і тут знойдзем, над чым паразважаць і нават папакутаваць”.*

Караткевічаў “Паром на бурнай рацэ” — твор даволі вядомы. Тэатры не раз браліся за яго пастаноўку. Але матэрыял, які вы ўбачыце на сцэне Дома афіцэраў, разы ў два большы, чым у апавяданні.

“Караткевіча я не дапісваў, — тым не менш кажа Дударaў. — *І ні ў якім разе не парушаў. Аднак ён празаік, таму давялося яго расшыфроўваць і дапісваць тое, што я адчуваю і чаго ён не сказаў па нейкіх прычынах”.*

Аднак пасля прагляду спектакля можа з’явіцца адчуванне, што Дударaў не толькі дапісаў, але і перапісаў Караткевіча, дадаўшы ў твор і новых дзеючых асоб, і сучасныя анекдоты. Змяніў не толькі прозвішчы *(Леановіч у драматурга губляе прыстаўку Пора-)*, але і характары герояў. Напрыклад, Гораў пасля самазабойства Леановіча на дуэлі (дарэчы, таксама прыдумка Дударава) выглядае разгубленым рамантыкам-ідэалістам і прызнаецца ўладам ва ўдзеле ў дуэлі супраць дамоўленасці з Леановічам. Урэшце, калі перад ці пасля прагляду спектакля вы прачытаеце “Паром на бурнай рацэ”, у вас саміх будзе магчымасць параўнаць творы і здзівіцца...

І не абурайцеся, пачуўшы са сцэны рускую мову. Дударaў усяго толькі імкнуўся як мага праўдзівей адлюстраваць падзеі: *“Царскія афіцэры Леановіч і Гораў не гаварылі па-беларуску, а вось салдаты, якіх прызывалі, гаварылі на сваёй роднай мове. Гэтага прынцыпу я і прытрымліваўся. Мне падаецца, што гэта вельмі арганічна. Да таго ж тэатр — не тое месца, дзе вырашаюцца моўныя пытанні. Для мяне як патрыёта Беларусі цяперашняе моўнае становішча — таксама моцная пакута, але што я магу зрабіць? Армія ў нас якая? Рускамоўная...”*

Драматург абяцаў, што спектакль будзе не цалкам рускамоўны. Нявольна можа з’явіцца ўражанне, што па-беларуску толькі і размаўляюць занядбаныя сяляне. Пра паўстанцаў 1863 года (калі адбываецца дзеянне) і добрага слова не сказана. Бунт ні да чаго добрага ніколі не прыводзіў — вось, здаецца, асноўная ідэалагічная мараль спектакля. Стаўленнем большасці герояў твора да інсургентаў п’еса нагадвае “Літоўскага ваўка” **Алеся Наварыча**. Можа, і драматург у дадатак да Дзяржаўнай прэміі СССР хутка атрымае званне лаўрэата спецыяльнай прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь?

На прэм’еру, як і на ўсе папярэднія пастаноўкі тэатра, прыйшоў міністр абароны **Леанід Мальцаў**.

“Ён ходзіць на ўсе нашыя спектаклі разам са сваёй жонкай і будзе хадзіць, — кажа Аляксей Дударaў. — *Ён не абяцаў, але я ведаю і адчуваю гэта. Гэта была яго ініцыятыва стварыць тэатр. Міністэрства робіць для нас усё, што можа. Тэатр патрэбны не толькі арміі — тэатр патрэбны ўсім без выключэння! А беларускаму воіну ён неабходны таму, што патрыёт — гэта найперш духоўны, па-другое — разумны, па-трэцяе — цывілізаваны чалавек. Перш-наперш трэба працаваць на духоўнасць, а не на тупое выкананне нейкіх пастулатаў. Тады і можна выхаваць патрыётаў. Мальцаў кажа, што добра ўзброены і фізічна падрыхтаваны, але бездухоўны воін — гэта кілер. А тое самае, але з духоўнасцю — абаронца Радзімы. Такі воін можа абараніць Бацькаўшчыну яшчэ да пачатку вайны, што і трэба рабіць заўжды”.*

Вальжына КОРСАК.

Народная Воля http://www.nv-online.info
2 ЛЮТАГА 2007 г.

СПОРТ

За легіянераў прыйдзецца плаціць?

На нарадзе, якая прайшла ў Асацыяцыі "Беларуская федэрацыя футбола" было прынята рашэнне аб тэрмінах правядзення Кубка федэрацыі. Ён пройдзе з 12 па 25 сакавіка. Удзел у ім прымуць каманды вышэйшай і першай лігі айчыннага першынства.

Падобны турнір існаваў у часы СССР. Яго гульні пройдуць у чатырох гарадах краіны — Мінску, Гродне, Віцебску і Пінску.

Акрамя таго, на разгляд выканкама Асацыяцыі "Беларуская федэрацыя футбола" была вынесена прапанова фінансавага характару. Прапануецца, каб за кожнага заяўленага клубамі замежнага футбаліста клубы плацілі па 1000 еўра.

"Мазыр" запрашае!

У Мазыры ў поўным аб'ёме распачаў сваю працу гарналыжны комплекс з аднайменнай назвай. Тут можна наведаць каток, лыжныя трасы, атракцыёны. Напракат выдаюцца канькі, сноўборды, горныя лыжы. У распараджэнні спартыўна-аздараўленчага комплексу маецца снежная "гармата", якая вырабляе 50 кубоў штучнага снегу за гадзіну, а цягам трох дзён можа пакрыць усю гарналыжную трасу комплексу.

Любы жадаючы можа наведаць "Мазыр" штодзень з 10 да 22 гадзін. Гадзіна пракату горных лыж і сноўбордаў каштуе 10 тысяч рублёў. Для дзяцей гэтая сума складзе 7000 рублёў.

У Нарвегію праз Швейцарыю

Для таго, каб трапіць у фінальную частку чэмпіянату свету па гандболе, зборнай Беларусі неабходна перамагчы швейцарцаў. Гэта стала вядома пасля жараб'ёўкі раунда плэй-оф, якая адбылася ў Вене. Дзве сустрэчы адбудуцца ў чэрвені бягучага года.

Нагадаем, што права выхаду ў плэй-оф беларуская каманда атрымала пасля перамогі ў адборачным турніры, выйграўшы ў каманд Малдовы, Кіпра і Славакіі.

А чэмпіянат свету пройдзе ў студзені 2008 года ў Нарвегіі.

Яшчэ адзін спарткомплекс у Мінску

У Мінску плануецца пабудаваць яшчэ адзін спартыўны аб'ект. Размова ідзе не пра "Мінск-Арэну", будаўніцтва якой ужо ідзе, а пра футбольную базу для зборных каманд. Аб тым, што такі аб'ект будзе пабудаваны, паведаміў старшыня Асацыяцыі "Беларуская федэрацыя футбола" Генадзь Нявыглас. База для футбалістаў будзе размяшчацца ў мікраёне "Дразды" — побач з комплексам футбольных палёў на праспекце Пераможцаў. Футбольны комплекс будзе ўключаць у сябе не толькі газоны, але і сучасны медыцынскі цэнтр. Плануецца, што аб'ект будзе здадзены ў 2011 годзе. На будоўлю комплексу ФІФА выдаткавала паўмільёна долараў.

Антон ВІТАЛЬЕЎ.

РАКУРС

«Пройдет немного времени, и мужчина, регулярно делающий маску для лица или посещающий косметолога, будет восприниматься совершенно нормально...»

Он занимается йогой, носит украшения, любит менять духи, хорошо разбирается в новинках моды, регулярно делает не только маникюр, но и педикюр, укладывает волосы. Не скрывает и не стесняется своей чувствительной натуры и не отрицает наличия в себе традиционно женских черт характера.

Он — метросексуал.

В представлении большинства метросексуал — это женоподобный тип нетрадиционной сексуальной ориентации, который красит ногти, губы и ресницы, говорит, жеманно растягивая звуки, и трясется над пылинкой на своей одежде. Приблизительно такой образ закрепился в нашем сознании в отношении относительно недавно появившегося термина *"метросексуальность"* и его представителей. Некоторые же и вовсе не знают, что это за зверь, и путают метросексуалов то с трансвеститами, то с гомосексуалистами.

Однако на самом деле все не так буквально.

Новый тип мужчин

Впервые термин "метросексуал" появился на страницах интернет-журнала Salon в 1994 году. Ввел его в обиход британский журналист Марк Симпсон, воодушевленный знаменитым сериалом "Секс в большом городе", где героини не устают удивляться, глядя на современных мужчин, вдруг повально увлекшихся модой, косметикой, психологией, экзотической кухней и прочими эфемерными гламурными материями. По определению Симпсона метросексуал — это *"молодой человек с приличным доходом, живущий в столице (метрополии) или рядом, — так как там расположены лучшие магазины, клубы, спортивные центры и салоны красоты. Его единственная сексуальная ориентация — любовь к самому себе и поиск наслаждений для себя"*.

Как бы там ни было, но Симпсон всего лишь дал определение явлению, которое существовало всегда. Достаточно вспомнить Онегина, который *"легко мазурку танцевал"*, был *"острижен по последней моде"* и *"как денди лондонский одет"*. Или мушкетеров во всех этих рюшечках и кружевах. Или красавчиков из XVII века, в чулках и напудренных париках. Сегодня метросексуалов просто стало больше. Последние лет сто в моде был "типичный мужчина" — мужчина-мачо. Все отклонения от этого образа считались чем-то ненормальным. И тут вдруг оказалось, что все больше и больше молодых людей не отказывают себе в удовольствии красиво одеваться и пользоваться хорошими косметическими средствами.

Кто они?

Есть мнение, что метросексуалы появились в результате активного феминистского движения. Мол, женщины добились права быть похожими на мужчин, а мужчины захотели быть похожими на женщин. Некоторые считают, что метросексуалы — это поколение изнеженных маменькиных сынков. Семьи рушатся, женщины воспитывают мальчиков в одиночку, и те, вырастая, просто не имеют понятия, как должен вести себя мужчина. Они знают, как ведет себя женщина. Поэтому в их поведении много черт, присущих слабому полу.

Они не собираются быть столпами патриархата — могучими, вонючими и волосатыми.

Теперь для этого типа мужчин выпускают журналы мод, открывают салоны, создают модные коллекции, парфюмерию, косметику и прочие товары первой метросексуальной необходимости.

Ольга ПРУДНИКОВА.

НЕПРЕДВЗЯТОЕ МНЕНИЕ

Светлана БЕЛЬСКАЯ, продавец:

— По-моему, мужчина-метросексуал — просто находка! Сколько плюсов — можно вместе сидеть на фруктовой диете, ходить в салон, делать друг другу макияж, обсуждать модные тенденции, услышать наконец дельный совет на вопрос: "А что мне сегодня надеть?.."

А КАК С ЭТИМ У НАС?

Есть ли в Беларуси метросексуалы? И как вы ухаживаете за собой?

С такими вопросами репортер "Народной воли" обратилась к модельеру, политику и телеведущему, которых публичная профессия обязывает быть в форме.

Саша ВАРЛАМОВ, модельер:

— Я считаю, что люди должны следить за собой. Человек любого пола, любого возраста, воспитания и образования обязан следить за свобой. Мы же не животные, чтобы не ухаживать за собой. Смешно, когда от людей дурно пахнет. И это в то время, когда в каждом доме есть горячая вода!

Мне приходилось общаться в Европе с людьми, которые достаточно тщательно за собой следят: моют машины, чистят обувь, приводят в порядок одежду, ходят в парикмахерскую, следят за ногтями. Почему мы не можем так жить? Разве мы не в Европе живем? Я считаю, что живу в Европе, я — европеец. Для меня это норма, которой должны соответствовать все.

Не думаю, что уместно говорить о том, будто эта норма не приживается у нас. Абсолютно все, с кем я общаюсь, следят за собой.

На мой взгляд, несправедливо, что маникюр или окрашенные волосы у мужчины до сих пор вызывают удивление или шок. Я тоже делаю маникюр, а волосы не крашу, потому что у меня их почти нет. Я хожу и в тренажерный зал, и в солярий, и на массаж, и в парикмахерскую, и в салоны. Ведь наше тело, организм — это, если хотите, дом, в котором мы живем, за которым нужно ухаживать, который нужно содержать в порядке. Перегар, щетина, всклокоченные волосы, покрасневшие глаза, нестриженые черные ногти — вот это, а не маникюр у мужчины, — ненормально и безобразно и должно вызывать шок.

Люди посещают салоны, потому что хотят нормально жить, хотят нравиться, доставлять удовольствие себе и окружающим. А если кому-то это не нравится — пусть едет в тундру — там ничего этого нет. Это мое мнение.

Анатолий КРАСУЦКИЙ, депутат Палаты представителей:

— Честно говоря, первый раз услышал термин "метросексуал"... Но я считаю, что мужчина не должен в аспекте ухода за своей внешностью сильно отличаться от женщины. Каждый хочет быть красивым, потому что красивый человек — как правило, счастливый человек. Я не думаю, что мужчины должны быть обделены чем-то. Ведь женщины спокойно вторглись в типично мужские сферы: они давно носят брюки, рубашки, тенниски, галстуки, например. Я уже не буду перечислять многие другие вещи, которые раньше принадлежали исключительно мужчинам.

Я тоже, как любой нормальный и воспитанный человек, естественно, ухаживаю за собой. Но не прилагаю к этому каких-либо чрезмерных усилий. Нет, наверное, ни одного человека, который не встал бы с утра и не помылся или не побрился, если речь идет о мужчинах. К счастью, у меня нет необходимости совершать специальные манипуляции, чтобы скрыть те или иные недостатки внешности. Природа меня достаточно наградила — у меня нормальная внешность. Салоны не посещаю — справляюсь самостоятельно. Сам, например, выбираю себе кремы, лосьоны, туалетные воды, которые, считаю, вполне мне подходят.

Мне кажется, особо тщательно нужно следить за собой публичным персонам: дикторам телевидения, актерам, музыкантам, политикам. Профессия вынуждает заниматься их этими вещами...

Сейчас бытует мнение, что ухоженные люди — это люди с определенным (совсем не маленьким) достатком, определенным положением. Наверное, должно пройти какое-то время, чтобы изменилось восприятие людей, их отношение ко всему новому, в том числе и к метросексуальности. Мы ведь цивилизованная страна, поэтому я уверен, что пройдет немного времени и мужчина, например, регулярно делающий маску для лица и посещающий косметолога, будет восприниматься нормально. И если сейчас существуют единичные салоны, где они могут пройти те или иные процедуры, то года через два-три эта сфера услуг приживется и у нас.

Один из самых стильных и ухоженных телеведущих телеканала ОНТ, в последний момент по каким-то причинам пожелавший остаться неназванным:

— По-моему, это очередное отклонение. Кто-то до потери сознания собирает марки и считает это самым главным событием своей жизни, а кто-то расстраивается по поводу сломанного ногтя. Человек, постоянно находящийся на виду, просто обязан уделять внимание своей внешнему виду. Но во всем, в том числе и в подходе к своей внешности, должны быть разумные пределы. Я не очень понимаю тех мужчин, кто убивается по поводу своей внешности. Впрочем, не понимаю и тех, кто не бреется и радуется тому факту, что сегодня воскресенье — значит, не надо чистить зубы. Это отклонения.

Да, есть те, кто активно следит за собой, ну и пусть — значит, им важнее внешность, нежели красота профессиональная или душевная. Ведь даже не вызывает желания спорить, если человек следит за собой, опрятно выглядит, если он красив не только внешне, но и внутренне, если он ведет себя красиво. Вот к какой красоте нужно стремиться в первую очередь, о какой красоте нужно говорить.

В отличие от некоторых коллег с других каналов, мне не хочется рассказывать о том, как я за собой ухаживаю. Если уж человек отдается какой-то профессии, то пусть о нем судят по его работе, а не по тому, сколько времени он проводит в салонах красоты.

Думается, что негатив по отношению к людям, отличающимся излишней ухоженностью, — это просто стереотип. Этакий штамп общественности, который с течением времени становится смешным или воспринимается как данность. Ведь времена меняются, и люди тоже меняются. За нами всеми еще тянется шлейф представлений советских времен, когда мы постоянно боролись с дефицитом, при котором нужно что-то достать, чтобы как-то выглядеть, а человек, который имел все, вызывал некоторую зависть и не везде воспринимался адекватно. Сейчас времена уже поменялись, но люди так быстро еще не изменились... Вообще же все это — игра определениями и понятиями, к которой я отношусь с долей иронии: этот — метросексуал, а этот — дваметрасексуал. Главное, чтобы человеку было комфортно и чтобы своим комфортом он не вызывал дискомфорта у окружающих.

ЛІСТ У РЭДАКЦЫЮ

Мы — за сяброўства!

Добры дзень, шаноўны спадар Сярэдзіч!

Да Вас звяртаецца група даўніх падпісчыкаў і чытачоў "Народнай волі". Па-першае, дзякуй Богу, што ёсць выданне, якое нясе нам думкі, меркаванні, пазіцыі пра тыя ці іншыя з'явы нашага жыцця, якія адрозніваюцца ад тых, што знаходзяць адлюстраванне ў афіцыйных выданнях. А ўжо справа чытача самому рабіць высновы, пагаджацца з надрукаваным ці не пагаджацца. Гэта і ёсць свабода слова, свабода поглядаў, бо калі ўсе думаюць аднолькава, то на самай справе ніхто нічога і не думае. Менавіта за дэмакратычнасць, за плюралізм мы і падтрымліваем "Народную волю".

Па-другое. Мы — аматары шашак і з нецярпеннем і цікавасцю чакаем з'яўлення тэматычнай рубрыкі з адпаведнай падборкай. Але ў апошні час, на жаль, яна выходзіць нерэгулярна. Мы разумеем: Вам хочацца даць больш разнастайных матэрыялаў, на Ваш погляд, больш важных як па тэматыцы, так і па актуальнасці. Але ж просім пры гэтым улічваць і нашы пажаданні. Заўважце, што калі прыходзіцца разглядаць задачы, прапанаваныя ў рубрыцы "Шашкі", мы стараемся ахапіць як мага большую колькасць аматараў гэтай інтэлектуальнай гульні, прыносім газеты на спаборніцтвы, ксеракапіруем іх. Многія з задавальненнем чытаюць усе матэрыялы, што з'яўляецца свайго роду рэкламай выдання. Дзякуючы публікацыям "Народнай волі" людзі пачынаюць паіншаму глядзець на многія рэчы. Скажам адкрыта: да таго часу, пакуль некаторыя нашы сябры не ўзялі ў рукі "Народную волю", яны не ведалі нават пра галадоўку А.Казуліна, пра яго патрабаванні ды і пра шмат што іншае.

Адным словам, сябруй, "Народная воля", з аматарамі шашак! Няхай рубрыка "Шашкі" часцей з'яўляецца на старонках газеты.

З павагай —

В.М.ГАЎРЫШ, І.Ф.ПРАЦУК, Ч.Б.СЕНКЕВІЧ, Ул.В.ПУШКІН, жыхары г.Паставы.

ГАЗЕТА — ЧЫТАЧЫ

Вы спазніліся?

Успомнілі, што своечасова не зрабілі **перадаплату** за лютаўскія нумары. Каб і ў далейшым мець пад рукамі сваю любімую газету, Вам, шаноўныя, трэба ўсё ж у самыя бліжэйшыя дні знайсці сродкі і па-новаму аформіць **перадаплату.** Дзеля гэтага мы і друкуем сёння ўзоры плацежкі і абаненцкай карткі.

Каб зрабіць **перадаплату** за лютаўскія нумары (а можна адразу і за нумары наступных месяцаў, нават усяго паўгоддзя), **тэрмінова** наведайце любы філіял "Беларусбанка", а там, дзе іх няма, — любое паштовае аддзяленне. Мінчане могуць аператыўна зрабіць **перадаплату** праз рэдакцыйны офіс (вул.Энгельса, 34а) альбо пазваніць па тэлефонах: 206-63-93 ці 206-68-71. Пасля званка да Вас прыйдуць нашыя валанцёры з новымі нумарамі газеты і дапамогуць аформіць **перадаплату** за любы тэрмін.

Нагадваем: сума **перадаплаты** за месяц ранейшая — **9500** рублёў для індывідуальных чытачоў і **15.000** рублёў для арганізацый, прадпрыемстваў, устаноў, фірм (за два месяцы адпаведна 19.000 і 30.000 рублёў). Банкаўскія рэквізіты "Народнай волі" такія:

УП "Народная воля": р/р 3012006535014, ААТ "Пріорбанк", ЦБП 113, код 749, УНН 100961759.

У чарговы раз звяртаем увагу на тое, што перасылаць у рэдакцыю трэба не толькі копію плацежнага дакумента, але і запоўненую **АБАНЕНЦКУЮ КАРТКУ,** узор якой друкуем і ў сённяшнім нумары. Зноў жа: запаўняйце выразна, пажадана друкаванымі літарамі.

Разумеем: для Вас, шаноўныя чытачы, гэта дадатковыя цяжкасці. Але што зробіш: каб Вы своечасова атрымлівалі газету, мы вымушаны звяртацца з такой просьбай.

Вы — з "Народнай воляй", "Народная воля" — з Вамі!

0402280179
ИЗВЕЩЕНИЕ

ИЧУП «Народная воля»
получатель платежа
«Приорбанк» ОАО ЦБУ 113 г.Минск
наименование банка
Счет получателя 3012006535014 Лицевой счет код 749
УНН* 100961759
(фамилия, имя, отчество, адрес)

Вид платежа			Дата	Сумма
Предоплата за февраль, март, апрель, май, июнь 2007 г. (ненужное зачеркнуть)				
Плательщик			Пеня	
			Всего	

Кассир

ИЧУП «Народная воля»
получатель платежа
«Приорбанк» ОАО ЦБУ 113 г.Минск
наименование банка
Счет получателя 3012006535014 Лицевой счет код 749
УНН* 100961759
(фамилия, имя, отчество, адрес)

Вид платежа			Дата	Сумма
Предоплата за февраль, март, апрель, май, июнь 2007 г. (ненужное зачеркнуть)				
Плательщик			Пеня	
			Всего	

КВИТАНЦИЯ
Кассир М.П.

* Заполняется только при осуществлении операции по уплате налогов

Абонентская карточка

на номера газеты «Народная воля»
за февраль, март, апрель, май, июнь 2007 года
(ненужное зачеркнуть)

Заполняется отчетливо ***печатными буквами*** *и* ***обязательно*** *отправляется в редакцию с* ***копией платежного документа***

фамилия
имя **отч.**
индекс почтового отделения
область
район
название населенного пункта
город, городской поселок, поселок, деревня (нужное — подчеркнуть)
улица пр-т переулок *(нужное — подчеркнуть)*
дом *а,б,в,г* **корп.** **кв.**

(Примечание: в случае получения газеты через абонентский пункт обязательно укажите индекс и адрес почтового отделения)

НАВАКОЛЛЕ

Выратавалі лебедзяў

Унікальную аперацыю па выратаванні лебедзяў правялі супрацоўнікі Міністэрства па надзвычайных сітуацыях Шумілінскага раёна. У часць патэлефанавалі жыхары пасёлка Прыазёрны і паведамілі, што на сярэдзіне Шумілінскага возера ў ледзяным палоне знаходзіцца чарада з 36 лебедзяў.

Птушкі, верагодна, прыляцелі сюды адпачыць, а нечаканы 18-градусны мароз уначы скаваў праталіну і лебедзяў у ёй. Выратавальнікі прымацавалі да днішча лодкі пенапласт, і, рызыкуючы жыццём, камандзір аддзялення пажарнай аварыйнай часці №1 Васіль Шыёнак стаў рухацца на ёй па тонкім лёдзе да сярэдзіны возера, дзе замерзлі лебедзі. А там, між іншым, была 9-метровая глыбіня.

З залатым вяселлем!

Дарагія мама Юлія Паўлаўна і тата Афанасій Сцяпанавіч Балігатавы!

Віншуем Вас з залатым вяселлем! Жадаем шчасця, любові, здароўя! Дзякуй за сардэчнасць, за тое, што любіце, шануеце сваіх дзяцей.

Кацярына, Алена, Пётра.

Адрас рэдакцыі:
220030, Мінск, вул.Энгельса, 34а.
Прыёмная: тэл./факс (017) 206-68-71.
Тэл./факс рэкламнага аддзела: 206-69-04, 206-69-06.
E-mail : nv@promedia.by
http://www.nv-online.info
Індэкс 63222

Заснавальнік і галоўны рэдактар Іосіф СЯРЭДЗІЧ

У сувязі з адсутнасцю магчымасці рэдакцыя матэрыялы не рэцэнзуе і не вяртае, права ўступлення ў перапіску пакідае за сабой. За інфармацыю, размешчаную ў рэкламных аб'явах, рэдакцыя не адказвае. Могуць друкавацца матэрыялы, у якіх пазіцыя аўтараў не падзяляецца газетай.
Пасведчанне аб рэгістрацыі перыядычнага выдання №246 ад 10 кастрычніка 1996 г. (пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі №224 ад 6 сакавіка 2000 г.).
Надрукавана ў ТАА "Типография Михайлова - С", 214020, г.Смоленск, вул. Шаўчэнкі, 86. Па заказе ТАА "Типография Михайлова", 214000, г.Смоленск, вул. Кастрычніцкай рэвалюцыі, д.38, кв.54. Падпісаны ў друк 31.01.2007 у 16.00. Аб'ём 4 друк. аркушы. Тыраж: 11 000 экз. Заказ №